УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ ВІЦЕБСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

# М а т э р ы я л ы

**першага этапу (школьны) Рэспубліканскай алімпіяды**
**па вучэбных прадметах**
**“Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”**
**для вучняў XI класа ўстаноў адукацыі**
**Віцебскай вобласці**
**(2016/2017 навучальны год)**

ВІЦЕБСК · 2016

***Першы этап (школьны) Рэспубліканскай алімпіяды***
***<u>па беларускай мове і літаратуры</u>***

**Водгук на мастацкі твор**
**XI клас**

Сяргей Законнікаў
## Добрае слова

Гэтай ісціне веру даўно,
І яна для мяне, як замова:
У людзей ёсць багацце адно:
Чалавечае, добрае слова.
Слова злое заўсёды было
Для варожасці першаасновай.
Свет
скрозь цемру дзікунства
вяло
Да святла
толькі
добрае слова.
Каб праменьчык жыцця не патух,
Душы
веснім дажджом
адмывала,

Чалавека абуджаны дух
На такія вышыні ўзнімала!
Гора золата і серабра –
Ад бяды ненадзейная схова.
І прыходзіць такая пара,
Што захочацца добрага слова.

Хлеба кошт не адзін:
то спаўна,
То над крошкай трасуцца галовы…
Не мяняецца толькі цана
Гэткай дробязі – добрага слова.

*Першы этап (школьны) Рэспубліканскай алімпіяды*
*<u>па беларускай мове і літаратуры</u>*

**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**
**XI клас**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** Падкрэсліце ў словах «ц», якое абазначае гук, здольны чаргавацца па цвёрдасці /мяккасці.

Цвёрда, пяць, вецер, цымбалы, цяжкі, цэлы, баец, цемень, цяпер, выцерці

*Максімальная колькасць балаў – 3*

**Заданне 2.** Размяркуйце словы па групах згодна з правіламі, якім адпавядае правапіс прапушчаных літар. Упішыце словы ў табліцу, сфармулюйце адпаведныя арфаграфічныя правілы.

Лід..р, каля ..рны, смаргон..скі. менедж…р, пачулася ..ханне, Юпіт..р, ліпен..скі, ба..л, восен…скі, Брэсцкая ..нія.

| **Групы слоў** | **Арфаграфічныя правілы** |
|---|---|
| 1) | |
| 2) | |
| 3) | |

*Максімальная колькасць балаў — 5;*
*0,2 бала — за кожнае правільна запісанае слова;*
*I бал — за кожнае правільна сфармуляванае правіла*

**Заданне 3.** Вызначце, ад якіх часцін мовы ўтварыліся наступныя прыслоўі, і запішыце іх у адпаведны слупок.

Глыбока, нашто, па-беларуску, здалёк, направа, двойчы, абы-дзе, нехаця, утрох, угары, зусім, крышачку, бегма, адвеку.

| **Прыслоўе ўтворана ад** | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| назоўніка | прыметніка | лічэбніка | займенніка | дзеяслова | прыслоўя |
| | | | | | |

*Максімальная колькасць балаў - 7;*
*0,5 бала – за кожны правільны адказ*

**Заданне 4.** Падбярыце і запішыце сінанімічны фразеалагізм да кожнага слова.

Далёка, блізка, непакоіцца, мала, (вельмі) стамляцца.

*Максімальная колькасць балаў - 5;*
*1 бал – за кожны правільны адказ*

**Заданне 5.** Адзначце пары слоў, якія не з'яўляюцца антонімамі. Запішыце антанімічную пару правільна.

1) апоўначы – апоўдні
2) прыемны – прыкры
3) хутка – павольна
4) сумаваць – гараваць
5) завязаць – перавязаць
6) уваходзіць – выходзіць
7) учора – раней
8) стары – дарослы
9) густа – пуста
10) адплываць – падплываць

Адказ ______________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________

*Максімальная колькасць балаў - 6;*
*0,5 бала – за кожны правільны адказ,*
*0,5 бала – за правільна падабраны антонім*

**Заданне 6.** Вызначце, у ролі якіх часцін мовы ўжываюцца выдзеленыя словы.

1. Ці не вецер ***гэта*** звонкі ў тонкіх зёлках шапаціць? (____________________)
2. ***Кожны*** адстойваў сваё меркаванне. (________________________________)
3. Прыгадваецца надпіс у ***адной*** сталоўцы. (____________________________)
4. ***Другая*** карціна, ***другія*** малюнкі. (_______________________________)
5. Хадзіў ці доўга ён, ці мала, ды толькі нешта ***адзін раз*** бяда ў бары яго спаткала. (________________________________________________)

*Максімальная колькасць балаў – 5*

**Заданне 7.** Устанавіце адпаведнасць паміж сказамі і іх відам. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў.

| | |
|---|---|
| А. Вуліцы горада. | 1. Двухсастаўны, развіты. |
| Б. Туман быў густы і цягучы. | 2. Двухсастаўны, неразвіты. |
| В. Мая зямля, надай мне сіл! | 3. Безасабовы. |
| Г. Мне часам хочацца крылатай птушкай узняцца ў паднябессе! | 4. Пэўна – асабовы. |
| Д. Над Нёманам тры векавыя дубы. | 5. Назыўны. |
| | 6. Двухсастаўны, няпоўны. |

Адказ ______________________________________________________________

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Заданне 8.** Пазнайце пісьменніка па пэўных фактах, з'явах, мастацкіх вобразах, назвах мастацкіх твораў.

| **Факты, з'явы, мастацкія вобразы, назвы мастацкіх твораў** | **Пісьменнік** |
|---|---|
| 1) Альбуць, настаўніцкая семінарыя, "Сымон-музыка", дзядзька Антось | |
| 2) Ніжні Ноўгарад, Яраслаўль, "Зімой", пясняр чыстай красы | |
| 3) Вязынка, "Спадчына", прарок нацыянальнага адраджэння | |
| 4) Кіраваградчына, Фішар, "Знак бяды", тэма вайны | |
| 5) Орша, "Нямоглы бацька", цыкл нарысаў, гістарычная тэматыка | |
| 6) Наваполацк, прафесійна-тэхнічнае вучылішча нафтавікоў, Мульцік, сучасны драматург | |

*Максімальная колькасць балаў – 6;*
*1 бал – за кожны правільны адказ*

**Заданне 9.** Адзначце нумары правільных азначэнняў.

1) гіпербала – іншасказанне, адна з форм мастацкага адлюстравання жыцця, калі абстрактнае паняцце або думка перадаюцца праз канкрэтны вобраз;
2) харэй – двухскладовая стапа ў сілаба-танічным вершаскладанні, у якой націск падае на першы склад ( ´__ __ );
3) да эпічных жанраў адносяцца раман, аповесць, апавяданне, навела, нарыс, фельетон;
4) лірыка – род мастацкай літаратуры, у якім жыццё паказваецца галоўным чынам праз узаемаадносіны паміж характарамі, іх барацьбу, праз дзеянне. У адрозненне ад іншых родаў, у лірыцы паказ жыцця будуецца на дыялогах і маналогах.

*Максімальная колькасць балаў* – 2

**Заданне 10.** У кожным радзе выявіце "лішні" твор. Запішыце і патлумачце свой выбар.

1. Васіль Быкаў – аўтар аповесцей "Жураўліны крык", "Сірочы хлеб", "Альпійская балада", "Сотнікаў".

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

2. П'есы "Вечар", "Кім", "Чорная панна Нясвіжа", "Зацюканы апостал" напісаў Аляксей Дудараў.

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

3. Літаратурную спадчыну Янкі Купалы складаюць паэмы "Магіла льва", "Гусляр", "Раскіданае гняздо", "Бандароўна".

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

*Максімальная колькасць балаў — 6;*
*0,5 бала – за кожны правільны адказ,*
*0,5 бала - за правільнае тлумачэнне*

***Першы этап (школьны) Рэспубліканскай алімпіяды***
***<u>па беларускай мове і літаратуры</u>***

**Тэмы вусных выказванняў**
**XI клас**

**Білет 1**

1. Уся паэзія – ад кахання.
   *Уладзімір Караткевіч*

2. Вочы маці!
   У доўгія зімнія ночы
   Вы над намі
   Вясёлымі зоркамі ззялі…
   *Ніл Гілевіч*

**Білет 2**

1. Літаратурны твор, які мяне ўразіў.

2. Магутнае слова ты, роднае слова!
   *Янка Купала*

**Білет 3**

1. Гісторыя маёй сям’і.

2. Усё мае свой працяг жыцця,
   Апроч няпраўды.
   *Максім Танк*

**Білет 4**

1. Ты – боль, паэзія. Ты – бой.
   Ты – праўда непрыступнай вежы.
   *Леанід Галубовіч*

2. 21 лютага адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы.

**Білет 5**

1. Святлана Алексіевіч – нобелеўскі лаўрэат: “Дзякуй маім настаўнікам – Адамовічу і Быкаву”.

2. Бедны той, хто не мае скарбаў вечных – скарбаў душы.
   *Цётка*

**Білет 6**

1. У нашым класе, у нашай школе ёсць такія традыцыі…

2. Хто згубіў памяць – згубіў усё.
   *Уладзімір Караткевіч*

**Білет 7**

1. Жыццём сваім, справай і смерцю вялікі – Кастусь Каліноўскі.

*Уладзімір Караткевіч*

2. Песня – душа народа.

**Білет 8**

1. Гістарычнае мінулае ў нашай літаратуры.

2. Уся вартасць людская жыцця ў тварэнні.

*Ларыса Геніюш*

**Білет 9**

1. Што такое чалавек перад знішчальнай сілай бесчалавечных абставін?..

*Васіль Быкаў*

2. Збіраўся скарб, струменіўся няспынна,
Вясёлкавым ірдзеннем мне спяваў…

*Якуб Колас*

**Білет 10**

1. Родны мой горад. (Родная мая вёска.)

2. Сілен, княжа, караць, галаву сілен зняць, –
Не скуеш толькі дум ланцугамі.

*Янка Купала*

**Білет 11**

1. Музыка ў маім жыцці.

2. Чалавек – гэта цэлы свет.

*Кузьма Чорны*

**Білет 12**

1. Я сёлета скончу школу…

2. Колькі вызнаў і вынес ты, краю мой мілы!

*Генадзь Бураўкін*

**Білет 13**

1. Нязгасная зорка паэзіі нашай – Максім Багдановіч.

*Алесь Бачыла*

3. З легендаў і казак былых пакаленняў…

*Максім Танк*

**Білет 14**

1. Свет нас прымаў як народ
   Па адной палачанцы.

   *Данута Бічэль*

2. Веды і дабрачыннасць як свечка, што асвятляе чалавеку шлях і не дае заблукаць.

   *Сымон Будны*

**Білет 15**

1. Там, дзе я жыву, варта паставіць помнік…

2. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі.

   *Францішак Багушэвіч*

**Білет 16**

1. Быў. Ёсць. Буду.

   *Уладзімір Караткевіч*

2. О Беларусь, мая шыпшына!
   Зялёны ліст, чырвоны цвет…

   *Уладзімір Дубоўка*

**Білет 17**

1. Я родам з Адраджэння. Ды цяпер
   Усім часам, прасторам я належу.

   *Мікола Арочка*

2. Чалавеку патрэбна не слава…

   *Сяргей Грахоўскі*

**Білет 18**

1. Мой любімы беларускі пісьменнік.

2. Не дай мне Бог духоўным стаць бадзягам,
   Без памяці жывой, без каранёў…

   *Васіль Зуёнак*

**Білет 19**

1. Біблія – дзівосная рака…

   *Францішак Скарына*

2. Люблю цябе і слухаю, прырода, такая блізкая парой любой!

   *Васіль Жуковіч*

**Білет 20**

1. Купала і Колас, вы нас гадавалі…

   *Пятрусь Броўка*

2. Дарогі ўсёй зямлі маёй
   Гудуць у стомленых нагах.

   *Уладзімір Караткевіч*